# З АГНЁМ БАЛЬШАВІЦКІМ У ГРУДЗЯХ



Захаваліся ўспаміны старога бальшавіка, актыўнага ўдзельніка Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі Д. І. Яфрэтава. У сярэдзіне чэрвеня 1917 года ён у саставе групы салдат прыехаў у Мінск на курсы агітатараў, што былі арганізаваны бальшавікамі, дзе і пазнаёміўся з лектарам В. Г. Кнорыным. Вільгельм Георгіевіч умела і жыва расказваў салдатам аб бягучым палітычным моманце, аб імперыялізме, аб вайне і рэвалюцыі і аб іншых падзеях, што адбываліся ў краіне. Яркае, жывое слова Кнорына пераконвала салдат ісці за бальшавікамі, аказваць бальшавіцкай партыі падтрымку ў барацьбе супраць эксплуататараў і рознага роду згоднікаў, супраць сіл контррэвалюцыі.

Кнорын быў не толькі лектарам, але і актыўным членам кіраўнічых рэвалюцыйных органаў на тэрыторыі Беларусі. У маі 1917 года Кнорын стаў сакратаром Мінскага Савета, а 3-га чэрвеня агульны сход Мінскага Савета выбраў яго ў састаў свайго выканаўчага камітэта.

У чэрвені — ліпені 1917 года мінскія бальшавікі стварылі самастойную партыйную арганізацыю. На чале яе стаяў Мінскі камітэт РСДРП(б) у саставе Мяснікова (старшыня), Кнорына, Фрэймана, Кузняцова, Галкіна, Фаміна і іншых.

У гэты час ЦК РСДРП(б) аказаў беларускім бальшавікам вялікую дапамогу. Пры актыўнай падтрымцы ЦК з 27 ліпеня (9 жніўня) 1917 г. у Беларусі пачала выходзіць бальшавіцкая газета «Звязда». Кнорын прыняў актыўны ўдзел у арганізацыі работы рэдакцыі. Па загаду Керанскага «Звязда» была закрыта. Але праз тры тыдні газета з'явілася пад загалоўкам «Молат». Галоўкаверх загадаў закрыць і «Молат». Аднак неўзабаве выйшаў «Буревестник», які набіраўся і друкаваўся ў маленькай друкарні Мінскага Савета. В. Г. Кнорын выступае на старонках газет з кароткімі, але гарачымі і трапнымі артыкуламі. Такі, напрыклад, яго артыкул «Дзень Саветаў», апублікаваны ў «Буревестнике» 26 кастрычніка. Гаворачы аб Саветах, аб перспектыве развіцця рэвалюцыі, Вільгельм Георгіевіч піша: «Цяпер перад Саветамі стаіць пытанне аб арганізацыі расійскай рэвалюцыі, аб рэвалюцыйнай уладзе. Задачы: стварэнне поўнага народаўладдзя, поўная свабода і поўнае разняволенне народа, спыненне анархіі ў вытворчасці. Гэтыя задачы буржуазія выканаць не можа... Мы патрабуем дыктатуры пралетарыяту і сялянства. Усе тыя, хто не адпавядае нашым імкненням, павінны быць зняты».

Адразу ж пасля ўзброенага паўстання ў Петраградзе мінскія бальшавікі заклікалі працоўных горада і вобласці падтрымаць сацыялістычную рэвалюцыю. Яны прынялі канкрэтныя рашэнні для замацавання першых сацыялістычных заваяванняў, для абароны Савецкай улады ад генералаў, што апалчыліся на яе, буржуазіі і рознага роду згоднікаў. Выканаць гэтыя рашэнні павінен быў Ваенна-рэвалюцыйны камітэт Заходняй вобласці і фронту, створаны вечарам 26 кастрычніка. У яго састаў разам з А. Мясніковым і іншымі таварышамі ўвайшоў В. Кнорын. 16 лістапада камітэт назначыў яго камісарам друкарняў па Мінску.

Да таго часу, калі Троцкім былі сарваны брэсцкія перагаворы, В. Г. Кнорын з'яўляўся старшынёй Мінскага гарадскога камітэта партыі. У сувязі з нямецкім наступленнем ён энергічна рыхтуе кадры для падпольнай работы, а пасля акупацыі Беларусі кіруе разам з І. Я. Алібегавым бальшавіцкім падполлем.

Кнорыну належыць пэўная роля ў стварэнні БССР і Кампартыі Беларусі. Ён выступаў з дакладам на І з'ездзе КП(б)Б, які адбыўся пасля выгнання немцаў з Беларусі. Калі ўтварылася Літоўска-Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, В. Г. Кнорын стаў сакратаром ЦК КП(б) Літвы і Беларусі.

31 ліпеня 1920 года была апублікавана «Дэкларацыя аб незалежнасці Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі». Разам з іншымі вядомымі дзеячамі гэты гістарычны дакумент падпісаў В. Г. Кнорын. Мінскі губком партыі па рашэнню Аргбюро ЦК РКП(б) быў пераўтваран у Цэнтральнае бюро КП(б) Беларусі. Яго сакратаром стаў В. Г. Кнорын. На чале партыйнай арганізацыі Беларусі ён прабыў да 1922 года ўключна. Беларуская рэспубліка ў той час знаходзілася ў надзвычай цяжкім эканамічным становішчы. Вільгельм Георгіевіч Кнорын як першы сакратар партыйнай арганізацыі Беларусі аддаў шмат сіл і энергіі справе будаўніцтва новага жыцця.

В. Г. Кнорын быў палымяным пра-

**Я. БАРАНОЎСКІ,**
**навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ.**

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы